**Людзі здаўна хочуць разгадаць сакрэт даўгалецця. Медыкі вызначылі трыяду, якая лягла ў аснову формулы: здаровы лад жыцця, аптымістычны светапогляд і псіхалагічна камфортная сістэма ўзаемаадносін. Гледзячы на майго героя – 88-гадовага Мар'яна Дзевятня з Войстама, - яго сакрэт даўгалецця я б вызначыла адным словам – зацікаўленасць. Да акаляючага асяроддзя, да людзей, да роднай мовы...**

# У кожнага мястэчка – свае Коласы і Купалы



**Мар'ян ДЗЕВЯЦЕНЬ.**

Практычна ўсё жыццё Мар'яна Антонавіча звязана з аграгарадком Войстам. Тут ён знайшоў другую палавінку, тут разам з любай жонкай гадаваў дваіх дзетак. У сорак восем гадоў стаў удаўцом: жанчына загінула пад коламі аўтобуса. На руках у мужчыны засталася малодшая сямігадовая дачушка, старэйшая вучылася на другім курсе ВНУ. Успамінаючы гісторыю саракагадовай даўніны, мой суразмоўца і цяпер не стрымлівае слёзы...

Маё ўяўленне малюе, як няпроста было тады Мар'яну Антонавічу прымяраць на сябе ролі хатняй гаспадыні і маці. "Косы малой заплятаў, каўнерыкі і манжэты на школьнай форме перашываў, урокі рабіць дапамагаў", - пералічвае мой суразмоўца справы, якія жыццё навучыла выконваць яго, моцнага мужчыну.

Работа ў мясцовай гаспадарцы забірала шмат часу, у механіка – кожная хвіліна на рахунку. Напэўна, усе гэтыя справы прыглушалі боль і не пакідалі часу для літаратурнай творчасці. Толькі калі Мар'ян Антонавіч пайшоў на пенсію, узяўся пісаць вершы і прозу. "Сачыненні ў школе мяне не палохалі. Але памятаю, як раздаў настаўнік сшыткі, а там невялікая прыпіска: "Сачыненне заслугоўвае выдатнай адзнакі, за граматнасць – "два". Быў у мяне недахоп ведаў па граматыцы", - прызнаецца мой суразмоўца.

Але калі голас сэрца не хоча шаптаць, то не варта стрымліваць парывы. Тым больш мой герой не прэтэндаваў і не прэтэндуе на высокае званне пісьменніка. Але тое, што ён стварыў за апошнія гадоў пятнаццаць, мае пэўную гістарычную і літаратурную значнасць.

Мар'ян Антонавіч паказвае мне дзве кнігі: вершаў – "Роднымі сцежкамі" і прозы – "Памяць сэрца". Свой творчы шлях у літаратуру пачаў з вялікай формы – з паэмы "Сказ пра родны калгас", дзе праўдзівыя падзеі (не прыцішаная праўда) і героі - рэальныя людзі, нават прозвішчы не мяняў. Атрымаўся цікавы летапіс гаспадаркі.

Увогуле, кніга вершаў мае чатыры раздзелы: "Лірыка" (дзе аўтар выказвае замілаванне беларускай прыродай), "Віншаванні" (родным, суседзям, знаёмым), "Аб мове" (разважанні пра родную мову) і "Успаміны". Сярод вершаў – прысвячэнне жонцы, напісанае праз шмат гадоў пасля яе смерці. Пры жыцці вершаў для любімай жанчыны ён не пісаў...

Мар'ян Антонавіч прызнаецца, што ў кнізе прозы шмат рэальных фактаў, але і аўтарская фантазія прысутнічае. Раней па рабоце ён шмат ездзіў у камандзіроўкі, у грамадскім транспарце не спаў, а назіраў за пасажырамі, прыслухоўваўся да іх гаворкі. Убачанае і падслуханае лягло ў аснову празаічных твораў. Плюс багаты мясцовы матэрыял. Большасць людзей ідзе да аўталаўкі за каўбасой і хлебам, а мой суразмоўца – яшчэ і каб паслухаць, пра што бабкі гавораць. Не проста, каб даведацца пра апошнія навіны, а каб потым штосьці яшчэ напісаць.

Кніг Мар'яна Дзевятня вы не знойдзеце ў кніжных крамах. Гэта штучны (ручны!) тавар. Калі назапасілася багата вершаў і апавяданняў, аўтар вырашыў надрукаваць кнігі. Асваенне камп'ютара яму, чалавеку з інжынернай жылкай, не выклікала цяжкасцей. Сам тэксты набраў, сам раздрукаваў, сам зрабіў вокладку і сшыў старонкі (прыпомніў бацькаў вопыт, калі ён рамантаваў для вясковых бабуль касцельныя "ксёнжкі"). Цяпер гэтыя кнігі – сямейная рэліквія, якая не мае цаны.

Мой суразмоўца бярэ ў рукі планшэт і пачынае чытаць новыя вершы. У яго планах – напісаць яшчэ адну кнігу. Праўда, камп'ютар выйшаў са строю. Але неўзабаве абяцалі адрамантаваць. А значыць, яшчэ адна кніга абавязкова з'явіцца.

**Галіна АНТОНАВА.**
**Фота аўтара.**

# Санітарны цягнік №218 адпраўляецца...

**Побач са станцыяй Залессе, каля чыгуначных пуцей, узвышаецца абеліск з цікавым лёсам. Гэта адзін з першых, магчыма нават самы першы ў нашым краі, мураваны помнік, які ўшаноўвае памяць абаронцаў Радзімы. Размешчаны ён на месцы пахавання салдат рускай імператарскай арміі, загінуўшых у баях восенню 1915 года.**



**Помнік ахвярам ПСВ у Залессі.**




**Першапачатковая шыльда на помніку ў Залессі.**

У міжваенны час гэтым мемарыяльным месцам апекаваўся святар Міхневічскай царквы, удзельнік Першай сусветнай вайны, пастыр Другога баявога атрада эскадры паветраных караблёў "Ілья Мурамец", кавалер Георгіеўскага медаля Апалінар Кансценчык. Працяглы час помнік, "апавіты" зараснікам, незаўважна ахоўваў месца апошняга спачыну салдат далёкай і прызабытай вайны.

У 2004 годзе сучасныя "варвары" скралі першапачатковую металічную шыльду, але тэкст з яе захаваўся, бо раней быў сфатаграфаваны краязнаўцамі смаргонскай гімназіі. Калектыў рэдакцыі "Светлага шляху" падтрымаў ініцыятыву па ўзнаўленні надпісу на новай табліцы і звярнуўся з такой прапановай да кіраўніцтва Беларускай чыгункі. Чыгуначнікі адгукнуліся на высакародную справу і вясной 2005 года на месца былой шыльды прымацавалі новую. Добраўпарадкавалі тэрыторыю каля помніка, і сёння старанна даглядаюць гэта мемарыяльнае месца.

З таго часу пачаўся пошук звестак пра пазначаны ў тэксце "Галаўны санітарны цягнік №218", персанал якога такім годным чынам вырашыў ушанаваць памяць загінуўшых воінаў.

Ваенна-санітарныя цягнікі прызначаліся для перавозкі параненых і хворых, былі рухомымі шпіталямі ў ваенны час. Іх фарміраваннем займалася, акрамя ваеннага ведамства, адна з буйнейшых грамадскіх арганізацый – Усесаюзны земскі саюз дапамогі хворым і параненым (УЗС). Сярод усіх чыгуначных транспартаў УЗС санітарны цягнік з нумарам 218 вылучаўся гісторыяй свайго ўзнікнення і выключным характарам работы. Ён сфармаваўся 13 (26) лістапада 1914 года на паўночна-заходнім фронце як вузкакалейны цягнік. Быў прызначаны абслугоўваць эвакуацыю параненых, падвозячы іх да цягнікоў шырокай каляіны. Спачатку ён лічыўся толькі прыдаткам да цягніка №187 і меў назву №187-біс. Складаўся ўсяго з некалькіх вагонаў, якія курсіравалі паміж Граевам і Лыкам ва Усходняй Прусіі. Пазней цягнік, ужо добра абсталяваны, абслугоўваў з лютага 1915 года Асавец і заставаўся пры крэпасці да апошніх дзён яе існавання. У гэты перыяд ён выконваў даволі кароткія рэйсы з крэпасці Асавец да Беластоку, чым пацвярджаў назву "галаўны", г. зн. разлічаны на работу выключна паблізу фронту дзеючай арміі ці нават на самой перадавой. Пры вялікай інтэнсіўнасці работы, з пачатку першага выхаду і да 1(14) верасня 1915 года, цягнік зрабіў 121 рэйс і перавёз 16 429 чалавек.

З восені 1915 года цягнік знаходзіўся на смаргонскім участку фронту. На ім эвакуіравалі параненых, дастаўлялі загінуўшых для пахавання ў Залессе. У 1916 годзе яго персанал прымаў удзел у дапамозе атручаным удушлівымі газамі.

Каб мець уяўленне пра склад цягніка і яго персанал, варта пазнаёміцца з дадзенымі на верасень 1915 года. Цягнік складаўся з 30 вагонаў і мог перавесці за адзін рэйс 297 чалавек. Для эвакуацыі прызначаліся вагон для афіцэраў, 6 вагонаў для лёгкапараненых і 15 цяплушак. Мелася таксама 8 службовых вагонаў, у лік якіх уваходзілі вагоны для перавязак, кухня, ледавік, сталовая, 2 вагоны адводзіліся пад склад харчоў і інвентара. Асабовы склад цягніка быў наступным: урач, упаўнаважаны, 6 сясцёр міласэрнасці, 29 санітараў, загадчык гаспадаркай, 3 асобы кухоннага персаналу і прыслугі.

Старэйшым урачом санітарнага цягніка была Наталія Апостолаўна Бераза. На той час яна атрымала Георгіеўскі медаль за тое, што за 6 месяцаў бесперапыннай дзейнасці ў абложанай крэпасці Асавец, пры ўмовах выключнай цяжкасці, пастаяннай небяспекі, самаадданна выконвала свае абавязкі па лячэнні і вывазе параненых. Пазней урач 218 галаўнога санітарнага цягніка была ўдастоена Георгіеўскіх медалёў 3-й і 2-й ступені.

Павел Пятровіч Корхаў, кавалер Георгіеўскага медаля, быў упаўнаважаным галоўнага камітэта Усесаюзнага земскага саюза, загадчыкам гаспадаркі цягніка. Ён займаўся фарміраваннем каманды, адказваў за ўнутраны парадак і за ўсю работу рухомай медыцынскай установы. Лічыцца, што пры яго непасрэдным кіраўніцтве і ўдзеле быў пабудаваны абеліск у Залессі.

Гэты помнік ушаноўвае памяць ахвяраў і пакутнікаў сусветнай вайны, узгадвае трагічныя старонкі нашага мінулага. Адначасова, знаходзячыся каля яго, можна аддаць даніну памяці медыкам і дапаможнаму персаналу, якія прымалі ўдзел у Першай сусветнай вайне. Дзякуючы хуткай дапамозе гэтых самаахвярных людзей былі выратаваны шматлікія жыцці параненых і хворых.

**Уладзімір ПРЫХАЧ,**
**краязнаўца.**